Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ВЕРАСНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 174 (28284)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**У аптэках з'явіўся «электронны рэцэпт»**
СТАР. 3



**Дзіцячае «Еўрабачанне» – учора і сёння**
СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Спорт у Беларусі мае значна большае значэнне, чым у іншых краінах. Вынікі неабходна разглядаць з пункту гледжання таго, колькі ўклала дзяржава ў падрыхтоўку да Гульняў і якія вынікі выступлення айчынных атлетаў. На Алімпіядзе беларускай камандай заваявана 9 медалёў, яна заняла 30-е месца ў агульным заліку па колькасці і 40-е месца па якасці ўзнагарод. Аналіз выступлення атлетаў, вядома, пакідае шмат пытанняў. Асобныя федэрацыі і спартсмены пайшлі ў празмерную камерцыялізацыю спорту, які павінен суправаджацца сур'ёзным менеджментам, але фінансавыя інтарэсы не павінны ўплываць на дзяржаўныя задачы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9472 | ▼ |
| Еўра | 2,1940 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0731 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Разьбярова навука



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Любанскай школе дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва працуе вядомы майстар Сяргей КОРБУТ. Ён — разьбяр па дрэве.

Сваім вучням выкладчык прывівае навыкі бачыць у звычайным дрэве самыя розныя вобразы.

■ Успамінаючы Рыа

## Іван ЦІХАН:

## «МЫ, СПАРТСМЕНЫ І БАЛЕЛЬШЧЫКІ, ПАВІННЫ БЫЦЬ, ЯК АДНА СЯМ'Я»

**Пасля вяртання з Рыа-дэ-Жанэйра ў Івана ЦІХАНА адразу ж пачаліся сустрэчы ў розных калектывах, але адна з іх, пэўна, асаблівая. Яго ўрачыста віталі жыхары шматпавярхоўкі на гродзенскай вуліцы Фолюш — не толькі як славутага спартсмена, цяпер ужо двойчы прызёра Алімпійскіх гульняў, двухразовага чэмпіёна свету, але і як добрага суседа. Самі намалявалі прывітальныя плакаты, запрасілі цыганскі ансамбль «Рада» і аркестр абласнога ўпраўлення МНС. Аказваецца, такія сустрэчы ў доме ўжо традыцыйныя.**

СТАР. 13



Фота БЕЛТА.

■ Фінансавая дасведчанасць

## ЯК СТВАРЫЦЬ УЛАСНУЮ СПРАВУ?

### Такое пытанне цікавіць кожнага трэцяга падлетка

**Якое з наступных сцвярджэнняў наконт накаплення сродкаў вы лічыце правільным? 1) Трэба рэгулярна адкладваць пэўную частку грошай, але сума можа змяняцца.**
**2) Трэба рэгулярна адкладваць аднолькавую суму грошай.**
**3) Трэба адкладваць грошы толькі тады, калі штосьці са сродкаў застаецца. 4) ...Толькі калі хочацца штосьці купіць.**
**5) Не трэба ўвогуле адкладваць грошы. Выбраць адказ прапанавалі школьнікам падчас правядзення ў 2015/2016 навучальным годзе маніторынгу фінансавай дасведчанасці навучэнцаў 8-х і 9-х класаў. Спецыялісты ўпраўлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі прадставілі на нацыянальным агульнаадукацыйным партале яго вынікі.**

Першы варыянт выбралі 48% навучэнцаў і 25% — другі. 7% падлеткаў лічаць, што грошы трэба адкладваць толькі на канкрэтную пакупку, а 0,4% увогуле не бачаць сэнсу ў накапленні грошай.

### СМАРТФОН СА ЗНІЖКАЙ

Падчас маніторынгу фінансавай дасведчанасці падлеткаў вывучаліся не толькі ўзровень сфарміраванасці фінансавых ведаў, але і здольнасць прымяняць гэтыя веды і ўменні на практыцы, а таксама фактары, якія ўплываюць на фарміраванне такой дасведчанасці. Удзел у даследаванні прынялі 953 навучэнцы 8-х і 9-х класаў і 29 намеснікаў дырэктараў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Тэст складаўся з 18 заданняў: 15 з іх прадугледжвалі выбар правільнага адказу з прапанаваных варыянтаў, а тры ўяўлялі сабой рашэнне фінансавых задач. На выкананне тэста адводзілася 45 хвілін.

Аналіз работ удзельнікаў маніторынгу паказаў, што высокі ўзровень фінансавай дасведчанасці маюць 22% навучэнцаў, сярэдні — 61% і нізкі — 17 %.

Найбольш лёгкімі для вучняў аказаліся пытанні накшталт: што такое крэдыт, які даход нельга назваць пастаянным, навошта на купюрах робяць вадзяныя знакі, хто можа даведацца крэдытную гісторыю чалавека, што рабіць, калі няма чым аплачваць крэдыт. Правільна адказалі на іх ад 91 да 97% навучэнцаў.

СТАР. 4

# ЗАХАВАЦЬ ГАЛОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## Імі для сучасных беларусаў з'яўляюцца мір на зямлі, дабрабыт у доме і ўпэўненасць у заўтрашнім дні

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.**

На мерапрыемстве вытворчы сектар прадстаўлялі кіраўнікі і супрацоўнікі некаторых прадпрыемстваў. Сярод іх — прадпрыемства «Волатаўта», завод дакладнай электрамеханікі, Мінскі завод колавых цягачоў, таварыства з абмежаванай адказнасцю «АГАТ — сістэмы кіравання». Прэзідэнт звярнуў увагу, што адметнасцю гэтых арганізацый стала ўкараненне ўласных распрацовак і развіццё новых для краіны галін. Паводле яго слоў, яшчэ з савецкіх часоў дасягненні беларускіх канструктараў былі вядомыя і прызнаныя ў свеце. «Прыемна бачыць, што традыцыі нашых выдатных вучоных прадаўжаюць актыўна развівацца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На цырымоніі ўшаноўвалі і вялікую групу людзей у пагонах, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. «З году ў год вы забяспечваеце высокую гатоўнасць да абароны нашай Радзімы, адстойваеце яе бяспеку і тэрытарыяльную цэласнасць, падтрымліваеце мір і стабільнасць на беларускай зямлі», — адзначыў Прэзідэнт.

У ліку тых, хто атрымаў ордэны і медалі з рук кіраўніка дзяржавы, — будаўнікі. У прыватнасці, работнікі «Мінскага спецыялізаванага ўпраўлення № 217, на рахунку якога ўзведзеныя аб'екты сацыяльна-культурнай сферы ў Мінску і Мінскай вобласці.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на высокім узроўні прафесіяналізму беларускіх медыкаў. Прэзідэнт запэўніў, што на дзяржаўным узроўні і ў далейшым будуць прымацца неабходныя меры для развіцця аховы здароўя і аказання на высокім узроўні медыцынскай дапамогі тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў заслугі айчынных вучоных у асобе прадстаўнікоў Нацыянальнай акадэміі Беларусі.

Звяртаючыся да ўзнагароджаных, Прэзідэнт закрануў тэму далейшага развіцця абараназдольнасці краіны. «Галоўная задача — абараніць нашу краіну. Мы нічога лішняга не хочам. Мы хочам, каб на нашым кавалачку зямлі, параўнальна невялікім, але не такім і малым, мірна жылі нашы дзеці. Каб яны жылі ў такой бяспечнай краіне, у якой жывём мы. Вось і ўся наша праблема, якую мы хочам вырашыць. Ну і яшчэ крышачку каб былі багацейшыя, гэта залежыць не толькі ад дзяржавы, але і асабіста ад усіх нас», — падкрэсліў ён.

«Таму давайце спакойна жыць і дзейнічаць. Калі хто-небудзь захоча штосьці вялікае стварыць асабіста, мы яму дапаможам. Калі хто-небудзь захоча мець свой кавалак зямлі і вырошчваць на ім хлеб — мы яму дапаможам. Але калі хто-небудзь хоча працаваць у калектыве — для гэтага ёсць усе ўмовы», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

# Падзяка Прэзідэнта

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне пра абвяшчэнне Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

За падрыхтоўку пятага Усебеларускага народнага сходу на высокім арганізацыйным узроўні падзяка аб'яўлена шэрагу службовых асоб, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Сярод іх намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава, міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі, міністр культуры Барыс Святлоў.

Падзякі Прэзідэнта за плённую працу, высокі прафесіяналізм, асабісты ўклад у развіццё асобных кірункаў народнай гаспадаркі ўдастоены работнікі розных сфер. За высокае прафесійнальнае майстэрства і значны асабісты ўклад у прадухіленне і спыненне эканамічных правапарушэнняў Падзяка Прэзідэнта таксама аб'яўлена некаторым работнікам Камітэта дзяржкантролю.

# ЗНАК САЛІДАРНАСЦІ

**Вынас дэлегацыяй беларускіх спартсменаў сцяга Расіі на цырымоніі адкрыцця Параалімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанейра з'яўляецца дзяржаўнай пазіцыяй. Аб гэтым БЕЛТА заявіла прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант.**

Яна адзначыла, што вынас сцяга ў час цырымоніі адкрыцця — ініцыятыва беларускай дэлегацыі. «Тым не менш падкрэслю, што гэта пазіцыя дзяржаўная, у тым ліку пазіцыя Прэзідэнта краіны, прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта, — заявіла Наталля Эйсмант. — Людзі з абмежаванымі магчымасцямі вельмі інтэрнацыянальныя, думаю, не будзе перабольшаннем сказаць, што параалімпійцы — гэта адна вялікая сям'я, незалежна ад нацыянальнасці чалавека. Менавіта таму абсалютна зразумелы гэты жэст нашых спартсменаў, і мы ў гэтым пытанні з расіянамі салідарныя цалкам».

Прэс-сакратар таксама сказала, што ніводнага факта, які даказвае прымяненне допінгу расійскімі параалімпійцамі, прад'яўлена не было, «а людзі, для якіх спорт — гэта больш, чым спорт, гэта ўсё іх жыццё, былі ад Параалімпіяды адхілены». «Вось гэта наша дзяржаўная пазіцыя і пазіцыя Прэзідэнта нашай краіны», — заявіла Наталля Эйсмант.

■ Парламенцкі дзённік

# Бюджэт на развіццё

**Праекты законаў рэспубліканскага бюджэту на 2017 год і ўнясенне дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс разгледзелі падчас пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. На мерапрыемстве прысутнічалі члены Прэзідыума Савета Рэспублікі, кіраўнікі міністэрстваў, абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, прамысловых прадпрыемстваў і бізнес-супольнасцей. У пасяджэнні прыняў удзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ** адзначыў, што на Пятым Усебеларускім народным сходзе вызначаны кропкі росту эканомікі на бліжэйшыя пяць гадоў. А гэта ў першую чаргу інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя і моладзь.

«Наша задача забяспечыць рэалізацыю гэтых прыярытэтаў. Праект рэспубліканскага бюджэту на 2017 год павінен быць сфарміраваны так, каб зрабіць неабходныя ўмовы для развіцця эканомікі краіны. Дадзеная сустрэча з'яўляецца працягам напружанай працы па ўнясенні дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс і падрыхтоўцы да разгляду ў Парламенце галоўнага закона года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2017 год». Яго трэба будзе ўхваліць пятаму скліканню дэпутатаў, такім чынам не перакладаючы гэты адказны момант на плечы новага парламента», — растлумачыў Уладзімір Панцюхоў.

Яшчэ 12 жніўня ў Савеце Рэспублікі былі разгледжаны праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год, а таксама параметраў асноўных паказчыкаў на 2018—2019 гады. Па словах Уладзіміра Панцюхова, абмеркаванне было прадметным, акрамя таго прагучалі заўвагі ў адрас распрацоўшчыкаў. Некаторыя з іх накіраваныя ў Мінфін, Мінэканоміку, МПЗ.

«Пісьмовыя адказы атрыманы не ўсе. Мы павінны заахвочваць міністэрствы і ведамствы, нашых грамадзян і бізнес-супольнасць да больш эфектыўнай і выніковай працы, яшчэ і таму, што ў нас няма вялікага манеўру, неабходны пошук рэзерваў росту даходнай часткі бюджэту, а яшчэ таму, што многае, што робіцца ў дзяржаве, фінансуецца за кошт бюджэту», — выказаў сваё меркаванне старшыня Камісіі.

Уладзімір Панцюхоў таксама адзначыў, што асаблівую важнасць сёння трэба надаць ацэнцы рэзерваў і рэальных магчымасцяў развіцця тэрыторый і прадпрыемстваў у краіне. Варта гэта зрабіць якраз падчас планавання бюджэту на будучы год. Сур'ёзная роля адводзіцца мясцовым Саветам дэпутатаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviada.by*

■

# Беларуска-кітайскія трактары будуць збірацца ў Літве

**У сталіцы Літвы адбыліся перамовы па пытаннях арганізацыі сумеснай беларуска-кітайскай вытворчасці трактароў на базе закрытага акцыянернага таварыства «Амкадор-Балтык» у г. Вільнюсе.**

Ініцыятарамі гэтых перамоваў з беларускага боку былі «Мінскі трактарны завод» і «Амкадор», з кітайскага — кампанія Zoomlion, якая з'яўляецца адным з вядучых сусветных вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі.

У перамовах у Вільнюсе прынялі ўдзел генеральны дырэктар кітайскай кампаніі Zoomlion Ванг Джынфу, генеральны дырэктар «Мінскага трактарнага завода» Фёдар Дамаценка, старшыня савета дырэктараў ААТ «Амкадор» Аляксандр Шакуцін, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Аляксандр Кароль.

«Па выніках перамоў падпісаны пратакол аб намерах па супрацоўніцтве ў сферы машынабудавання. Мяркуецца, што беларускія трактары з выкарыстаннем кітайскіх камплектуючых будуць збірацца на «Амкадор-Балтык» у Вільнюсе з перспектывай далейшых паставак на рынкі краін Еўрасаюза і Еўразійскай эканамічнай супольнасці, а таксама пры дапамозе Клайпедскага марскога порта — у Кітай», — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Пасольстве Беларусі ў Літве.

Для вытворчасці камплектуючых плануецца задзейнічаць патэнцыял беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

У беларускай дыпмісіі таксама адзначылі, што дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы і падпісанні дагавора аб стратэгічным супрацоўніцтве ў галіне маркетынгу і тэхнічных аспектаў рэалізацыі гэтага праекта.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**

## ПЫТАННІ БУДУЦЬ ВЫРАШАНЫЯ

**Мінгарвыканкам і аблвыканкамы праводзяць 10 верасня чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на тэлефонныя званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васілевіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч (80172224444).

■ Выбары-2016

# СІМБІЁЗ АСОБЫ І ІДЭЙНАСЦІ

**Лічаныя суткі застаюцца да дня выбараў. За каго лепей аддаць свой голас? І ўвогуле, як зразумець, што кандыдат у дэпутаты дае не пустыя абяцанні, а сапраўды здольны палепшыць жыццё ў акрузе? Пра гэта і тое, якія асаблівасці мае бягучая парламенцкая выбарчая кампанія, разважае палітолаг Мікіта БЯЛЯЕЎ.**



***— Ці мае сёлетняя выбарчая кампанія нейкія адрозныя ад папярэдніх рысы?***

— Сёлетняя выбарчая кампанія ў параўнанні з мінулай парламенцкай праходзіць ярка і цікава. У межах дыскусійна-аналітычнай супольнасці «Ліберальны клуб» мы праводзілі даследаванне ў 2012 годзе: вывучалі праграмы кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. На жаль, вялікая колькасць з іх паўтараліся, а некаторыя былі проста скапіраваны. Цяпер да падрыхтоўкі праграм кандыдаты паставіліся больш адказна, аднак ізноў-такі далёка не ўсе. Сярод асобных заяў усё яшчэ можна пабачыць неактуальныя і папулісцкія праграмы. Але праведзеная праца, асабліва ў параўнанні з папярэднімі парламенцкімі выбарамі, адразу заўважная. Цяпер часцей у праграмах можна пабачыць рашэнні праблем не толькі рэспубліканскага маштабу, але і лакальнага — акруговых. Акрамя таго, з'явіліся агітацыйныя матэрыялы на білбордах. Ёсць параўнальны прагрэс у афармленні інфармацыйных стэндаў і распаўсюджванні лістовак.

Але, на мой погляд, гэтага недастаткова. Усе ж такі дэпутатам на сваёй пасадзе варта праяўляць больш ініцыятывы ў заканадаўчай дзейнасці, адчуваць адказнасць за прынятыя рашэнні. Сёння няпростая эканамічная сітуацыя ў краіне. У яе паляпшэнні могуць адыграць значную ролю менавіта парламентарыі, падзяліўшыся ідэямі ў развіцці краіны і распрацаваўшы адпаведную дарожную карту. Менавіта гэтага і чакаюць ад новага склікання парламента: большай дзейнасці і ідэйнасці.

***— Ці актыўней сябе сталі праяўляць партыі?***

— Так, сапраўды. Некаторыя паляпшэнні ёсць. Але калі паглядзець на змястоўнасць іх працы, то не заўжды можна казаць пра прарыў. Новых канкрэтных прапаноў, наноў распрацаваных праграм ад партый не паступала. У некаторых з іх нават самі партыйныя праграмы не аднаўляліся шмат гадоў і адлюстроўваюць рэаліі жыцця дзесяці- ці нават дваццацігадовай даўнасці.

***— Якія формы агітацыі сёння найбольш распаўсюджаныя і эфектыўныя?***

— Досыць эфектыўна маглі б працаваць пікеты, калі б на іх людзям прадстаўляліся актуальныя і адпаведныя рэчаіснасці праграмы і ідэі кандыдатаў. Але часта пікеты робяцца ныбіта для «галачкі». Хоць гэта прамая магчымасць для кандыдатаў пагутарыць з выбаршчыкамі, наладзіць з імі кантакт. І тут адказнасць ляжыць перш за ўсё на плячах будучых кандыдатаў: ці атрымаецца расказаць пра свае ідэі так, каб зматываваць чалавека прыйсці на выбарчы ўчастак і аддаць голас менавіта за цябе. Увогуле выбарчая агітацыя ў нас часцей за ўсё заключаецца ў мітынгах ці праводзенні забаўляльных мерапрыемстваў.

***— Кожны, несумненна, будзе рабіць выбар сам. Але што б параіў палітолаг выбаршчыкам: на што варта перш за ўсё звяртаць увагу?***

— Я б параіў уважліва прачытаць біяграфію кандыдата — той шлях, які ўжо прайшоў чалавек. Але сам кіруюся менавіта праграмай прэтэндэнтаў на дэпутацкае крэсла. Бо яна — гэта аснова, ад якой мусіць надалей адштурхоўвацца кандыдат. Дастойны кандыдат у дэпутаты — гэта сімбіёз асобы і ідэі. Звяртаем увагу на шлях — бачым асобу, а пра ідэі можам прачытаць у праграме. Важна, каб ён прадстаўляў інтарэсы жыхароў сваёй акругі і змог прыйсці ў парламент з заканадаўчымі прапановамі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## УСЁ ПА ГРАФІКУ

**За межамі Беларусі ўтворана 47 участкаў для галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання. Пра гэта на ўчарашнім брыфінгу паведаміў Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў.**

— Як і на тэрыторыі Беларусі, 11 верасня выбарчыя ўчасткі будуць адкрыты з 8.00 да 20.00, — праінфармаваў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства. Па яго словах, датэрміновае галасаванне таксама ажыццяўляецца па адпаведным графіку, гэта значыць з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін па мясцовым часе размяшчэння выбарчага ўчастка.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Крэатыў

# Ініцыятывы — да ўвасаблення

**Пытанні партнёрства дзяржавы і моладзі сталі галоўнымі падчас «Адкрытага дыялогу» ў Гомелі. Сюды з усіх раёнаў вобласці з'ехаліся маладыя людзі — лідары абласной арганізацыі БРСМ. Экспертам яны задавалі вострыя пытанні і выказвалі свае ідэі.**

— На мой погляд, дыялог атрымаўся, — адзначыла старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ, кіраўнік праекта «100 ідэй для Беларусі» Алеся Віннік. — І спікеры, і моладзь сябе рэалізавалі. Моладзь задавала пытанні, якія былі пачуты.

Са жніўня на Гомельшчыне прайшло больш як 40 аналагічных сустрэч, у якіх узялі ўдзел звыш 2,5 тысячы маладых людзей. На апошняй пад назвай «Дзяржава і моладзь: у партнёрстве залог поспеху» маладыя людзі выступілі з прапановамі стварыць музей гісторыі студатрадаўскага руху, правесці сустрэчы прадстаўнікоў розных маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў. Адной з тэм для абмеркавання на сустрэчы сталі выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

— Поспех передвыбарнай гонкі залежыць ад саміх кандыдатаў у дэпутаты, ад іх вызначаных мэт і перакананняў, — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАЎГАЛА.** — Важна на кожным выбарчым участку звярнуць увагу на маладых людзей, якія галасуюць упершыню. На выбарах мы аддаём свой голас за міралюбную палітыку дзяржавы, за развіццё краіны, яе рух наперад.

Юнакі і дзяўчаты цікавіліся: якімі лідарскімі якасцямі павінен валодаць сёння малады чалавек, каб стаць паспяховым у сваёй галіне, як трапіць у перспектыўны кадравы рэзерв. Былі і пытанні, нечаканыя для спікераў: з якімі складанасцямі сутыкнуўся бы сённяшні малады чалавек, калі б ён апынуўся ў 1980—1990-х гадах, што было б складана для маладога чалавека з тых часоў у сучасным свеце? Як уплываюць сацыяльныя сеткі на фарміраванне грамадства?

Таксама былі агучаны думкі, звязаныя з папулярызацыяй сямейных каштоўнасцяў і магчымасцю падтрымкі дзяржавай маладых сем'яў. Варта адзначыць, што сустрэча стала пляцоўкай абмеркавання сапраўды актуальных і цікавых для моладзі тэм.

— Такіх пляцовак павінна быць значна больш, — адзначыў **першы сакратар Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ Ігар ЗАВАЛЕЙ.** — Усе ініцыятывы, якія былі агучаны падчас шматлікіх «Адкрытых дыялогаў» у Гомельскай вобласці, не ўяўляюць сабою нічога складанага ў плане рэалізацыі. У хуткім часе мы іх прапрацуем з мясцовай выканаўчай уладай і рэалізуем.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Новая практыка

# У АПТЭКУ — З КАРТКАЙ ПАЦЫЕНТА

**У апошні месяц лета сталічныя паліклінікі актыўна пачалі ўводзіць у выкарыстанне пластыкавыя карткі для медыцынскага абслугоўвання.**

Знешне гэта звычайная пластыкавая картка накшталт банкаўскай або той, якой мы плацім за праезд. Дызайн зацверджаны Міністэрствам аховы здароўя. Медыцынская картка змяшчае ўнікальны нумар, замацаваны ў медыцынскай інфармацыйнай сістэме за канкрэтным пацыентам. Для павышэння хуткасці ўвядзення гэтага нумару на картку нанесены штрых-код, які счытваецца сканерамі.

Атрымаць такую картку ўрэшце павінен кожны пацыент. І для гэтага яму трэба прад'явіць у паліклініцы пашпарт (для дзяцей, якія не маюць пашпарта, неабходна прад'явіць пасведчанне аб нараджэнні і пашпарт аднаго з бацькоў). Рэгістратар праводзіць зверку неабходных персанальных даных (прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, адрас месца пражывання і інш.) са звесткамі, раней унесенымі ў электронную медыцынскую картку ў базе даных установы аховы здароўя. Абавязкова заносіцца асабісты нумар пацыента з пашпарта або пасведчання аб нараджэнні. Пасля завяршэння зверкі персанальных звестак рэгістратар з дапамогай спецыяльнай функцыі шляхам счытвання штрых-кода з карткі сканерам уводзіць унікальны нумар карткі ў электронную медкартку базы даных паліклінікі. Далей рэгістратар на спецыяльнай паласе карткі шарыкавай ручкай запісвае прозвішча і ініцыялы пацыента, а таксама заносіць прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас пражывання, асабісты нумар і нумар карткі ў бланк формы інфармаванай згоды пацыента аб выкарыстанні пластыкавай карткі медыцынскага абслугоўвання і перадачы абмежаванай персанальнай інфармацыі аб ім па каналах сувязі. Пацыенту перадаюцца картка і бланк для азнаямлення і падпісання. Пасля падпісання бланк уклейваецца ў амбулаторную картку.

Такім чынам, цяпер для атрымання лекавых сродкаў, выпісаных у выглядзе рэцэпта ў электроннай форме, пацыент будзе прад'яўляць картку ў аптэцы, дзе ўжо ёсць магчымасці выкарыстання інфармацыйнай сістэмы «Электронны рэцэпт».

— У нашай паліклініцы закуплена неабходная колькасць картак для выдачы нашым пацыентам, некаторыя — пераважна льготнай катэгорыі — ужо атрымалі магчымасць набыцця лекаў з іх дапамогай, — тлумачыць **валеолаг 13-й гарадской паліклінікі г. Мінска Людміла СЛЫШКІНА.** — Калі вы згубіце такую картку, то атрымаеце іншую з новым індывідуальным нумарам. Калі сваяк або нейкая іншая давераная асоба папросіць вас набыць лекі ў аптэцы замест сябе, то яна павінна пры гэтым перадаць вам сваю картку. Такая магчымасць допускаецца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# ДА СУСЕДЗЯЎ — НА БАЙДАРЦЫ

**Бургамістр Аўгустова Войцэх ВАЛЮЛІК у свой афіцыйны візіт да суседзяў накіраваўся не аўтамабілем, а на байдарцы. Мэр Гродна Мечыслаў ГОЙ і старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ сустракалі гасцей у раёне цэнтральнага пляжа на Нёмане.**

Разам з кіраўніком адміністрацыі Аўгустова (дарэчы, шматразовым чэмпіёнам Польшчы ў веславанні на байдарках) водным шляхам паміж суседнімі гарадамі прайшлі вядомыя польскія весляры — у бязвізавым рэжыме, які ўстаноўлены Указам Прэзідэнта Беларусі для замежных грамадзян пры наведванні турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал» і прылеглых да яго тэрыторый.

— Сплаў польскай дэлегацыі паказаў, што водны шлях у Гродна існуе і, спадзяёмся, будзе запатрабаваны, — зазначыў Мечыслаў Гой.

— Магчымасць наведвання беларускай часткі Аўгустоўскага канала без віз адкрые яшчэ большыя перспектывы для ажыццяўлення сумесных турыстычных праектаў, і наш сплаў, думаю, стане для гэтага добрай рэкламай, — лічыць Войцэх Валюлік.

Гэтыя перспектывы суседзі падмацавалі пагадненнем аб супрацоўніцтве ў розных сферах. Зараз, напрыклад, рыхтуецца сумесны трансгранічны праект па будаўніцтве веласіпедна-пешаходных мастоў праз Нёман у Гродне і праз раку Нета ў Аўгустове, які будзе пададзены на конкурс праграмы міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*


**УП «Забудова-Автотранс» (организатор аукциона) извещает о проведении второго повторного открытого аукциона по продаже имущества**

| № лота | Наименование Лота | Начальная цена с НДС, бел. рублей | Задаток с НДС, бел. рублей | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль VAZ-11184 2011 г.в. | 3 436,8 | 34,37 | 5 |
| 2 | Автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT 2001 г.в. | 5 097,6 | 50,98 | 5 |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо, в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль.
Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 26.09.2016 в 13.00 по адресу: Минская обл., Молодеченский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4**

Заявки на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 12.09.2016 по 23.09.2016.
Документы, необходимые для участия в торгах, – заявление на участие в аукционе; платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя). Необходимые документы должны быть представлены по адресу: Минская обл., Молодеченский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4 **не позднее 16 часов 00 минут 23 сентября 2016 г.**
Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества, выставляемого на торги.
Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с 3012164225082 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226. Получатель – УП «Забудова-Автотранс», УНП 600468334.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.
Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.
Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.
Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона. По вопросу ознакомления с Лотом связываться по телефону 8 029 160 11 86 в рабочие дни с 8.00 до 17.00

☎ **Организатор: 8 (0176) 724 711**


■ Надвор'е

# Восень пакуль «адпачывае»

## На выхадныя сіноптыкі абяцаюць месцамі да плюс 29 градусаў

**Сапраўды па-летняму цёплае надвор'е ў нашай краіне чакаецца ў выхадныя, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**



Фота Івана КУПАРВАСА.

Нягледзячы на тое, што восень ужо нагадвае пра сябе халаднаватымі начамі і ранішнімі туманамі, верасень яшчэ парадуе нас цеплынёй. Так, у пятніцу надвор'ем на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе 17—23 цяпла, прычым халадней будзе на паўночным усходзе краіны, а па паўднёвым захадзе сонейка пачне прыпякаць да плюс 24—28 градусаў.

На выхадныя да нас завітаюць і ўвогуле цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. Таму прагназуецца новая хваля летняга цяпла. Цудоўная пагода, але ў сувязі з адсутнасцю ападкаў павялічваецца пажарная небяспека для лясоў, асабліва ў паўднёвых раёнах краіны. У суботу чакаецца без дажджоў. Уначы і раніцай у асобных раёнах згусціцца туман, а тэмпература паветра складзе 7—14, у паўночна-ўсходніх раёнах — плюс 4—6 градусаў. Аднак удзень будзе значна цяплей, калі чакаецца плюс 20—27 градусаў, па паўднёвым захадзе — нават да 29 цяпла. Не прагназуецца ападкаў і ў нядзелю. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Нават ноччу стане значна цяплей, калі прагназуецца не ніжэй 9—16 цяпла, а ўдзень чакаецца ўвогуле да плюс 22—29 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, да сярэдзіны наступнага тыдня захаваецца вельмі цёплае для восені надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ў панядзелак удзень месцамі па паўночнай палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпературны фон яшчэ павялічыцца і будзе больш нагадваць жнівеньскія зводкі. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—16 цяпла, удзень прагназуецца плюс 22—28, а па паўднёвым захадзе месцамі будзе нават і да 30 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Будзьце пільнымі ў лясах!

## Надвор'е тоіць пагрозу для ўгоддзяў

**Нягледзячы на каляндарную восень, па поўдні краіны пажаранебяспечная абстаноўка застаецца складанай.**

І хоць у цэлым па Беларусі клас пажарнай небяспекі вагаецца ад першага да трэцяга, у большасці раёнаў Гомельскай вобласці ўстаноўлены высокі — чацвёрты, і ўведзены забароны на наведванне лясоў, паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса. Па прагнозах сіноптыкаў, неўзабаве становішча яшчэ больш абвострыцца, у тым ліку і ў асобных раёнах Брэсцкай вобласці, дзе клас пажарнай небяспекі можа дасягнуць максімальнага паказчыка — пятага. У сувязі з гэтым дзяржаўная лясная ахова ўзмацніце кантроль за захаваннем правіл пажарнай бяспекі ў лясах.

Да ведама. Усяго з пачатку пажаранебяспечнага сезона ў лясах Мінлясгаса адзначана 241 выпадак узгарання на плошчы 129,7 гектара. Гэта значна менш леташніх паказчыкаў, калі за аналагічны перыяд было зафіксавана 994 выпадкі пажараў на плошчы 5600 гектараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЗМЕІ ЕХАЛІ З МАСКВЫ Ў ПАРЫЖ

**Незвычайную кантрабанду знайшлі супрацоўнікі Брэсцкай мытні ў цягніку Масква — Брэст.**

Пры аглядзе акустычнай сістэмы вагона пільны мытнік звярнуў увагу на пластыкавыя кантэйнеры. Унутры названых пасудзін сядзелі гадзюкі і пітоны. Усяго рэптылій налічылі 46. Як паведамілі ў прэс-групе Брэсцкай мытні, у спробе перамясціць тавар за мяжу падазраецца праваднiца цягніка, грамадзянка Расіі. Да рашэння суда жывая кантрабанда перададзена на захаванне ў мінскі заапарк.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*


*В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 349 от 17.07.2014 г.*
**сельскохозяйственный производственный кооператив «Драпово» Слонимского района сообщает о начале проведения процедуры реорганизации путем преобразования в КУП (коммунальное унитарное предприятие).**
УНП 500061939

# ЯК СТВАРЫЦЬ УЛАСНУЮ СПРАВУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А найбольш цяжкімі былі пытанні, для адказаў на якія трэба было ведаць, хто такі страхавальнік, якія паслугі прадастаўляе Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь (з імі справіліся ўсяго 24-25% навучэнцаў), хто мацней пацерпіць ад інфляцыі, якія дакументы даюць права купіць валюту ў банку, якія абавязацельствы ўзнікаюць у чалавека, калі ён даў афіцыйную згоду выступіць паручыцелем па крэдыце свайго сябра (44% правільных адказаў).

З фінансавай задачай, дзе патрабавалася вызначыць найлепшыя для пакупніка ўмовы куплі смартфона (ноўтбука), справіліся ў сярэднім 58% навучэнцаў. У задачы называліся першапачатковая цана тавару (смартфон — 2 млн недэнамінаваных беларускіх рублёў і ноўтбук — 6 млн рублёў) і памеры зніжак, прапанаваныя ў розных крамах. Навучэнцам трэба было выбраць правільны адказ з прапанаваных і прывесці матэматычнае рашэнне, якое абгрунтоўвае выбар.

Найбольш тыповымі недахопамі пры вырашэнні гэтай задачы сталі адсутнасць матэматычнага рашэння і памылкі ў вылічэннях.

## ОПТАМ ЦІ НА ВАГУ?

Удзельнікам маніторынгавага даследавання была прапанаваная сітуацыя куплі прадуктаў на рынку ў розніцу і оптам:

«На рынку таматы можна купіць кілаграмамі або скрынямі. Адзін кілаграм каштуе 15 000 рублёў. А скрыня таматаў вагой 10 кілаграмаў каштуе 120 000 рублёў.

1. Запішыце абгрунтаванне, якое падтрымлівае сцвярджэнне «Больш выгадна купіць скрыню памідораў, чым асобныя кілаграмы на вагу».

2. Растлумачце, чаму для некаторых людзей купля скрыні памідораў можа быць дрэнным фінансавым рашэннем».

Такое заданне ацэньвала здольнасць навучэнцаў інтэрпрэтаваць і выкарыстоўваць фінансавую і лікавую інфармацыю для тлумачэння свайго рашэння. У першым варыянце трэба было параўнаць два варыянты куплі таматаў і растлумачыць, які варыянт ( «скрыняй» або «на вагу») забяспечвае найлепшыя суадносіны кошту і якасці. У адказе навучэнцы павінны былі адлюстраваць відавочнае або невідавочнае прызнанне таго, што цана за кілаграм таматаў у скрыні меншая, чым кошт памідораў, якія прадаюцца па кілаграмах. З гэтым заданнем справіліся 77% навучэнцаў.

Заданне другога варыянту правярала, ці разумеюць навучэнцы, што купля прадуктаў оптам можа быць рашэннем непасільным і марнатраўным, калі вялікая колькасць прадуктаў не патрабуецца. Навучэнцы маглі атрымаць максімальны бал за гэтае заданне, калі ў іх адказе было адлюстравана разуменне хоць бы адной з прычын, па якой купля памідораў па больш нізкай цане не заўсёды можа быць добрым рашэннем і не для ўсіх: адны не могуць дазволіць сабе высокі кошт пакупкі оптам, а іншым не трэба так шмат тавару, які хутка псуецца. З гэтым заданнем справіліся ўсяго 48% навучэнцаў. Адказ пра нявыгаднае фінансавае рашэнне для пакупніка навучэнцы падмянялі разважаннямі кшталту: «Гэта нявыгадна прадаўцам памідораў, бо на кожнай скрыні яны губляюць 30 000 рублёў». У другім варыянце, нягледзячы на пастаўленую задачу, навучэнцы ўсё роўна пісалі пра тое, што выгадна купіць памідоры оптам: «Больш выгадна купіць цэлую скрыню і пасля гэтага забыцца пра куплю таматаў на цэлы тыдзень»; «Выгадна купіць скрыню таматаў, таму што гэта танней.»

## ДАХОДЫ І ВЫДАТКІ

У ходзе маніторынгу была выяўлена залежнасць вынікаў выканання тэста «Фінансавая дасведчанасць» ад узроўню матэматычнай падрыхтоўкі навучэнцаў. А вось значных гендарных адрозненняў наадварот, не выяўлена. Сярэдні вынік юнакоў склаў 15,4 бала, а дзяўчат — 15,7 бала.

Затое даследчыкі ўстанавілі сувязь паміж прафесійнай дзейнасцю, адукацыяй бацькоў і ўзроўнем фінансавай дасведчанасці навучэнцаў. Сярэдні бал навучэнцаў, чые бацькі займаюцца высокакваліфікаванай працай, складае 16,5; сярэдні бал навучэнцаў, чые бацькі займаюцца нізкакваліфікаванай працай, роўны 14,8.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Узровень фінансавых ведаў вучняў устаноў адукацыі, размешчаных у гарадской мясцовасці, вышэйшы, чым у навучэнцаў устаноў адукацыі, размешчаных у сельскай мясцовасці. Сярэдні бал за выкананне тэста гэтымі катэгорыямі навучэнцаў склаў адпаведна 16 і 14 балаў.

Навучэнцы, якія прымалі ўдзел у маніторынгу, не вывучалі мэтанакіравана пытанні, звязаныя з фінансавай дзейнасцю, г. зн. ніхто з іх не наведваў факультатыўныя заняткі «Асновы эканамічных ведаў». Інфармаванне па асобных пытаннях, звязаных з фінансавай дзейнасцю, ажыццяўлялася, у асноўным, на класных і інфармацыйных гадзінах, падчас сустрэч навучэнцаў з прадстаўнікамі банкаў. З асобнымі пытаннямі, звязанымі з фінансавай дзейнасцю, навучэнцы маглі пазнаёміцца ў рамках вучэбнага прадмета «Матэматыка».

Разам з тым 57% навучэнцаў адзначылі, што яны самастойна чыталі кнігі, артыкулы, глядзелі тэлеперадачы, інтэрнэт-сайты па пытаннях, звязаных з такой дзейнасцю. Сярэдні бал за выкананне тэста ў вучняў, якія самастойна цікавіліся фінансавымі пытаннямі, роўны 16, а ў тых вучняў, якія не цікавіліся, на бал меншы.

Фарміраванне першага вопыту навучэнцаў ва ўпраўленні асабістымі грашовымі сродкамі адбываецца ў сям'і. Падчас апытання была атрымана наступная інфармацыя: большасць вучняў (75%) знаёмыя з практыкай вядзення сямейнага бюджэту, ведаюць, што ў іх сям'і вядзецца ўлік даходаў і выдаткаў. Каля трацiны рэспандэнтаў вядуць улік сваіх асабістых сродкаў, фіксуючы пры гэтым усе паступленні і выдаткі. 5% фіксуюць толькі паступленні. Палова навучэнцаў не вядзе ўліку, але дакладна ведае, колькі ў іх маецца грошай. Каля 13% уліку не вядуць і гэтай праблемай не цікавяцца.

На пытанне «Як вы лічыце, для чаго варта назапашваць зберажэнні?» 73% навучэнцаў адказалі, што на выпадак непрадбачаных выдаткаў; 46% — для паляпшэння свайго жыцця ў будучыні; 34% — каб быць фінансава незалежным, мець магчымасць рабіць свой выбар; 20% — для атрымання дадатковых даходаў у выглядзе працэнтаў па ўкладах; 18% — каб пакінуць нешта ў спадчыну сваім дзецям; 14% — для забеспячэння жыцця на пенсіі.

## КАЛІ ГРОШАЙ НА ПАКУПКУ НЕ ХАПАЕ...

Дарэчы, у падлеткаў запыталіся, у якіх выпадках атрыманне крэдыту ў банку яны лічаць апраўданым? Думкі навучэнцаў размеркаваліся наступным чынам: «у выпадку выкарыстання крэдыту для аплаты навучання» — так адказалі 57% навучэнцаў; «крэдыт мае сэнс браць у сітуацыі, калі стаўка па крэдыце ніжэйшая за стаўку па ўкладзе» — 26%; «калі вельмі хочацца нешта купіць, а ўласных грошай не хапае» — 18%; «для выгаднага набыцця неабходных тавараў падчас распродажу» — 16%; «калі чалавеку тэрмінова патрэбен адпачынак, а аплаціць яго няма магчымасці» — 7%. Не змаглі адказаць на гэтае пытанне 12% навучэнцаў.

Як, на ваш погляд, трэба паступіць, калі грошы заканчваюцца да атрымання новага даходу? 78% навучэнцаў лічаць, што трэба скарацiць спажыванне і пачаць эканоміць. 8% — накіруюць на свае патрэбы раней назапашаныя зберажэнні. 5% падлеткаў адказалі, што трэба звярнуцца па дапамогу да знаёмых, сваякоў (пазычыць). 4% — што трэба шукаць дадатковую працу. 1% — узяць крэдыт у банку. І 3% навучэнцаў не змаглі даць адказ.

А па якіх фінансавых пытаннях хацелі б атрымаць інфармацыю навучэнцы? Высветлілася, што 36% навучэнцаў жадалі б больш даведацца пра стварэнне сваёй справы (фірмы), 27% — пра спосабы эканоміі грашовых сродкаў, 23% — пра страхаванне жыцця і рызык, 21% — пра выкарыстанне банкаўскіх пластыкавых картак, 20% — аб працаўладкаванні ў канікулярны час і 17% — аб праграмах фінансавай дапамогі студэнтам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# «Белсаюздрук» «асвойвае» новыя тэрыторыі

## У сталічным мікрараёне Каменная Горка адкрыўся гандлёвы павільён

**Тыя, хто сочаць за навінамі сталіцы, дакладна ведаюць, што ў Каменнай Горцы вядзецца актыўнае будаўніцтва жылля: амаль ніводная размова пра развіццё гарадской інфраструктуры не абыходзіцца без згадвання гэтага мікрараёна. Дзіцячыя сады, школы, паліклінікі, а такасама гандлёвыя аб'екты ўзводзяцца ўслед за жылымі дамамі. Прадпрыемства «Белсаюздрук» вырашыла не чакаць, калі ўзнікне вострая неабходнасць, а загадзя падрыхтаваць усе ўмовы для камфортнага жыцця на новым месцы.**



Павільён усталявалі на прыпынку на скрыжаванні вуліц Калеснікава і Налібоцкай. Побач — два гандлёвых цэнтры, будуюцца дамы. Як адзначаюць спецыялісты, пасажырапаток павінен быць вялікім. Гэта відаць і адразу пасля адкрыцця: за першую гадзіну працы — 30 наведвальнікаў: дарослыя мужчыны шукаюць цікавую газету для чытання па дарозе на працу, школьнікі дакупляюць прыгожыя сшыткі да новага навучальнага года, маладыя мамы з дзецьмі выбіраюць першыя кнігі казак.

— *У вас ёсць васковыя крэйды?*

— На жаль, цяпер няма, але мы зробім усё магчымае, каб яны з'явіліся як мага хутчэй, — разгортваецца дыялог паміж прадаўцом і пакупніцай.

Плошча павільёна невялікая — 24 квадратныя метры, таму размясціць у ім увесь асартымент тавараў немагчыма. Аднак выйсце ёсць. Любы неабходны тавар можна заказаць на сайце bspechat.by, а пасля атрымаць у пункце выдачы, г.зн. у найбліжэйшым павільёне. Дарэчы, аформіць заказ можна на месцы — у гандлёвым пункце ёсць бясплатны Wi-Fi. На сайце прадстаўлены добры выбар друкаванай прадукцыі, у тым ліку і калекцыйных выданняў, кніг, сувеніраў і падарункаў, цацак, да новага навучальнага года была дапоўнена лінейка школьных прылад і вучэбнай літаратуры. Акрамя таго, на гэту катэгорыю тавараў да 31 кастрычніка распаўсюджваецца 10-працэнтная зніжка. Каб яе атрымаць, дастаткова прад'явіць шматразовы купон, які раздаюць у гандлёвых аб'ектах «Белсаюздрук».

І, вядома, у павільёне ўсім прапаноўваюць каву на вынас, якая ўжо стала фірменным знакам. Адметнай рысай прадпрыемства «Белсаюздрук» з'яўляецца арыентацыя на патрэбы пакупнікоў. Напрыклад, павільён у Каменнай Горцы ў будныя дні пачынае працу, як толькі на прыпынку з'яўляюцца першыя пасажыры — а палове сёмай раніцы. Для паскарэння працэсу абслугоўвання тут упершыню ўсталявалі плацежны тэрмінал для бескантактных картак: каб аплаціць пакупкі на суму да 20 рублёў, не трэба ўводзіць пін-код або распісвацца.

— Галоўную цікавасць для нас уяўляюць новыя раёны. Мы разам з жыхарамі сталіцы ствараем свой горад мары, прыгожы і зручны. Наша задача ў тым, каб газету, кнігу або канцылярскія прылады чалавек мог купіць побач з домам, не марнуючы час на паездку ў цэнтр горада. Аднак пры гэтым ён не павінен быць абмежаваны ў выбары, таму мы імкнёмся прапанаваць пакупнікам максімальна шырокі асартымент тавараў, якія карыстаюцца папулярнасцю, — падкрэсліў **начальнік сектара па паслугах «Белсаюздруку» Андрэй ГАРКАВЫ.**

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Конкурсы

# НАПІШЫ ЛІСТ НАСТАЎНІКУ!

**Рэспубліканскі завочны конкурс літаратурных работ «Пасланне настаўніку» абвешчаны ў Беларусі. Яго арганізатарамі выступаюць Міністэрства адукацыі і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**

Конкурс праводзіцца сярод вучняў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў чатырох узроставых групах: ад 6 да 9 гадоў, ад 10 да 13, ад 14 да 18 і ад 18 да 25 гадоў.

Пісьмовая творчая работа можа быць напісана ў форме кароткага апавядання, паэмы, верша, эсэ на рускай ці беларускай мове. Асаблівая ўвага будзе надавацца матэрыялам, якія суправаджаюцца рознымі жанрамі медыямастацтва: відэаарт, відэаінсталяцыя (відэазапіс з чытаннем аўтарскага літаратурнага матэрыялу або ілюстрацыя тэксту відэамалюнкам), саўндарт (аўдыязапіс аўтарскай працы з выкарыстаннем музыкі і разнастайных гукаў). Работы трэба дасылаць на паштовы ці электронны адрас Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі nchtdm@mail.ru з пазнакай «Пасланне настаўніку».

У пасланні ці прысвячэнні павінна раскрывацца роля настаўніка ў жыцці аўтара. Конкурсныя работы будуць ацэньвацца па наступных крытэрыях: адпаведнасць тэме, сацыяльная значнасць і змястоўнасць работ; творчы падыход, неардынарнасць і крэатыўнасць выканання матэрыялаў, стыль выкладання (выразнасць аўтарскага стылю, аўтарская інтанацыя, прыёмы падачы матэрыялу), інфарматыўнасць, арфаграфічная пісьменнасць.

Прадугледжаны два этапы. Першы — рэспубліканскі. Да 20 верасня ўдзельнікі павінны накіраваць свае работы ў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. З 20 па 29 верасня экспертная група іх ацэньвае.

Другі этап — падвядзенне вынікаў, узнагароджанне прызёраў і пераможцаў, запрашэнне пераможцаў конкурсу на ўрачыстую сустрэчу, прысвечаную Дню настаўніка, якая адбудзецца 30 верасня 2016 года.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на партале Міністэрства адукацыі ў раздзелах Сістэма адукацыі / Упраўленне сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай працы / Актуальна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ПАЗНАЮ Я ІХ ПА ГАЛАСАХ

## Беларускія ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» — учора і сёння

**Сёлета Беларусь 14-ы раз прысутнічае на міжнародным дзіцячым песенным конкурсе «Еўрабачанне». Літаральна днямі прадстаўнікі нашай краіны ўзялі ўдзел у арганізацыйнай нарадзе разам з тэлекампаніямі іншых краін — удзельніц конкурсу, дзе былі абвешчаны чарговыя змены ў фармаце музычнага форуму. Так, шоу канчаткова ператварылася з дзіцячага ў цінейджарскае: узроставыя межы для канкурсантаў звузіліся з 9 да 14 гадоў. Прытым для кожнага ўдзельніка дзіцячага «Еўрабачання-2016» прадугледжаны асобны настаўнік з ліку папярэдніх канкурсантаў, якія цягам тыдня будуць узмоцнена рыхтавацца да паспяховага выступлення. Таксама змяніўся з вячэрняга на дзённы час правядзення самога музычнага шоу. Нарэшце, у гэтым годзе арганізатары цалкам выключылі з конкурсу глядацкае галасаванне, аддаўшы правы выбару пераможцы нацыянальным журы: дзіцячаму і даросламу (па схеме 50/50).**

Тым часам, як расказалі «Звяздзе» ў Белтэлерадыёкампаніі, распачалася падрыхтоўка сёлетняга прадстаўніка Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні-2016», што пройдзе 20 лістапада на Мальце. Для 13-гадовага **Аляксандра Мінёнка,** які стаў пераможцам нацыянальнага адбору з песняй «Музыка маіх перамог», настаў напружаны перыяд шматлікіх інтэрв'ю, канцэртных выступленняў і штодзённых рэпетыцый: спеўных — з педагогам па вакалу Таццянай Трухан і танцавальных — з дзіцячым ансамблем «Сенсацыя». Акрамя таго, у нядаўняй анлайн-канферэнцыі на сайце медыяхолдынга www.tvr.by Саша расказаў, што ў конкурснай песні «будуць некаторыя дабаўленні» і зменіцца аранжыроўка, а нумар з выкарыстаннем сігвеяў планецца яшчэ больш ускладніць дзеля відовішчнасці. Зрэшты, падрыхтоўка працягваецца, і ўсіх сакрэтаў беларуская творчая каманда загадзя выдаваць не збіраецца.

Мы ж напярэдадні вялізнага музычнага шоу давайце прыгадаем, куды падзеліся і кім сталі ранейшыя найбольш яркія прадстаўнікі нашай краіны.

### Першая



Музычнай «піянеркай» ад Беларусі стала 10-гадовая ўраджэнка Кобрына **Вольга Сацюк,** якая прыняла ўдзел у першым дзіцячым «Еўрабачанні» — конкурс прайшоў у 2003 годзе ў Капенгагене. Беларускамоўная песня «Танцуй» прынесла маленькай спявачцы 4-е месца з 16 магчымых — пагадзіцеся, для дэбюту вельмі нават няблага!

За 13 гадоў, што мінулі з таго часу, Воля вырасла і ў



творчым, і ў самым звычайным сэнсе, скончыла Беларускі ўніверсітэт культуры і мастацтваў, шмат дзе спрабавала сябе на эстрадзе (напрыклад, пэўны час з'яўлялася салісткай у вядомым гурце «Краскі»), а таксама як мастачка, аўтарка песень і тэлевядучая. Цяпер Воля ў якасці дыпламаванай спецыялісткі працуе педагогам па вакале ў рокшколе Discovery, працягвае сур'ёзна займацца музыкай і не выключае свайго ўдзелу ў дарослым «Еўрабачанні». Зусім нядаўна, дарэчы, артыстка прэзентавала новы беларускамоўны музычны кліп «Анёл», зняты яшчэ адным экс-удзельнікам дзіцячага «Еўрабачання» Аляксеем Жыгалковічам.

### Самыя паспяховыя

